# Не страляй па птушцы!

Хоць бы ў год, які мы вызначылі як час асаблівага клопату пра родную зямлю
Год роднай зямлі, які адзначаецца сёлета, паняцце маштабнае, але мы закранём толькі некаторыя праблемы навакольнага асяроддзя, бо калі пра іх гаварыць, як не ў гэты год?

А ахоўваць на Брэстчыне ёсць што. Толькі асабліва ахоўваемыя прыродныя тэрыторыі і аб’екты складаюць 461,3 тыс. гектараў, а гэта 14% тэрыторыі вобласці. Нацыянальны парк, 17 рэспубліканскіх і 26 мясцовых заказнікаў, 66 помнікаў прыроды знаходзіцца на гэтай тэрыторыі. А яшчэ эколагам неабходна кантраляваць якасць навакольнага асяроддзя, сачыць за будаўніцтвам водаахоўных аб’ектаў, станам ачышчальных збудаванняў гарадоў, прамысловых прадпрыемстваў, жывёлагадоўчых комплексаў...

А ахоўваць на Брэстчыне ёсць што. Толькі асабліва ахоўваемыя прыродныя тэрыторыі і аб’екты складаюць 461,3 тыс. гектараў, а гэта 14% тэрыторыі вобласці. Нацыянальны парк, 17 рэспубліканскіх і 26 мясцовых заказнікаў, 66 помнікаў прыроды знаходзіцца на гэтай тэрыторыі. А яшчэ эколагам неабходна кантраляваць якасць навакольнага асяроддзя, сачыць за будаўніцтвам водаахоўных аб’ектаў, станам ачышчальных збудаванняў гарадоў, прамысловых прадпрыемстваў, жывёлагадоўчых комплексаў...

На комплексы, найперш, і звернем увагу, бо яны на вачах і праблемы, у плане экалогіі, добра вядомыя і зразумелыя.

Наяўнасць комплексаў, на якіх утрымліваюцца дзесяткі тысяч галоў жывёлы — гэта каласальны ціск на навакольнае асяроддзе, але гэты фактар падчас узвядзення гэтых жывёлагадоўчых комплексаў не браўся ў сур’ёзны разлік. А ў той жа час у краінах Заходняй Еўропы такія вялікія комплексы былі забароненыя.

— Многія жывёлагадоўчыя камбінаты ўжо эксплуатуюцца па 20-30 гадоў, і іх неабходна абнаўляць, праводзіць рэканструкцыю, — сказаў намеснік начальніка Баранавіцкай інспекцыі прыродных рэсурсаў Алег Загурскі, — а самая вялікая бяда на такіх сельгаспрадпрыемствах — гэта адхіленне ад тэхналогіі. Сцёкі павінны праходзіць працэс асвятлення, разбаўлення вадой, іх нельга зліваць у адно месца на полі...



Калі на абмежаванай прасторы сканцэнтравана столькі жывёлы, то навакольныя палі перанасычаныя нітратамі, бо сцёкі вывозяцца ў такой колькасці, што ад тых нітратаў у бяда. Яны ў зямлі і ў калодзежнай вадзе найбліжэйшых вёсак.

Аднойчы сусед, чалавек ужо ва ўзросце, папрасіў на пасадку

вінаград. Выбраўшы самы лепшы саджанец, я пасадзіў яго там, дзе дзед паказаў — у метры ад ганка. На наступны год вінаград пайшоў у рост, даў пасынкі і... пачаў засыхаць. І не было зразумела, ад чаго, у чым прычына. А пазней высветлілася, што дзед кожную раніцу выходзіў на ганак і пускаў струмень пад вінаград.

Сцёкі з-пад жывёлы найлепш распырскваць раўнамерна, але часта ідуць самым простым шляхам — вывозяць цыстэрнай на поле і адкрываюць засаўку. Даводзілася бачыць, як цэлая бочка вылівалася ў адным месцы. Можа, трактарыст эканоміў салярку ці не хацеў трэсціся ў кабіне... Нельга сцёкі выліваць і на снег, бо з паводкай яны трапляюць у вадаёмы і рэкі.

І ўсё ж гэта ўчарашні дзень. Будаваць, як некалі, і жыць у тых умовах ужо немагчыма.

Год таму я напісаў артыкул, у якім выказаў занепакоенасць наконт будоўлі датчанамі свінакомплексу ў Ляхавіцкім раёне. Ён узводзіцца ў некалькіх кіламетрах ад Шчары, а ўлічваючы, што там на ўтрыманні будзе штогод 60 тыс. свіней, то трывога зразумелая.

І вось узвядзенне аб’екта ўступіла ў стадыю завяршэння. Усе, хто пабываў там, сцвярджаюць, што ў датчан ёсць чаму павучыцца. І кіраўніцтва вобласці ставіць комплекс у прыклад іншым будаўнікам.

**Начальнік аддзела экспертызы Брэсцкага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў Сяргей Кушнір сказаў:**

— Мая справа — не кантроль, а экспертыза праектаў. Скажу, што пададзены праект адпавядаў нашым праваахоўным законам, а як усё будзе на практыцы, пакажа час. Гэта датычыцца і ачышчальнай сістэмы. Там усё даволі арыгінальнае, нават адкорм свіней. Парасят ад нараджэння да забою трымаюць пры свінаматцы, а ў нас так не робіцца. На тэрыторыі комплексу нават трава не павінна расці, каб птушкі не залятали.

Асаблівa трывожыцца не выпадае, бо гэты комплекс па ўсіх параметрах, у тым ліку і ў экалагічным плане, перавышае аналагічныя аб’екты, узведзеныя раней.

Абнадзейвае тое, што ў нас на дзяржаўным узроўні робяцца крокі для захоўвання навакольнага асяроддзя. Іншая справа, наколькі яны эфектыўныя і ці спраўляюцца адпаведныя прыродаахоўныя структуры з пастаўленымі перад імі задачамі.

У экалагічнай інспекцыі поле дзейнасці шырокае, і правы ёй дадзены вялікія, але ці можа інспекцыя выкарыстаць іх на ўсю моц?

Праблема ў тым, што экалогія з’яўляецца заложніцай эканомікі, і так ва ўсім свеце. Вунь ЗША не жадаюць падпісваць пагадненне аб скарачэнні выкідаў прамысловых адходаў у паветра, а Японія, нягледзячы на пазіцыю іншых краін, працягвае забіваць кітоў. І ў Саюзе было тое ж самае. Эканамічныя інтарэсы перацягвалі экалагічныя.

Пяцьдзесят гадоў таму ўзвялі найбуйнейшы ў Еўропе тэкстыльны камбінат, а на адстойніках вырашылі зэканоміць. У той час камбінат працаваў у тры змены, і ўсе хімічныя адходы скідваліся ў каналізацыю. Баранавіцкі "Водаканал" толькі цяпер уздыхнуў з палёгкай, бо ў тэкстыльнага "задышка".

Многае залежыць ад таго, як ставяцца да экалагічных праблем дзяржаўныя структуры, але не трэба скідваць з рахунку і пазіцыю асобнага чалавека.

У мінулым годзе праводзілася аперацыя "Чыстае паветра" — правяраліся на таксічнасць і задымленасць адпрацаваныя газы аўтамабільных рухавікоў. У вобласці было выяўлена 1527 аўтамашын, якія эксплуатаваліся з парушэннямі — таксічнасць перавышала вызначаныя нормы. Такіх аўтамашын у разы больш, бо выяўлены толькі тыя, каго "тармазнулі" выбарачна.

Адкуль гэтыя аўтамашыны ўзяліся? Хіба яны не праходзілі тэхагляд? Нехта ж у талон-сертыфікат паставіў чалавеку штамп, што з выхлапнымі газамі ўсё ў парадку.

Выйсце не ў штрафах, бо браканьеры, нягледзячы на вялікія штрафныя санкцыі, не знікаюць, а ў змяненні маральна-псіхалагічнага стану грамадства. Чалавек яшчэ не разумее, што зрабіўшы шкоду прыродзе, ён шкодзіць сабе. І праблему нарматыўна-прававымі актамі не вырашыць. Любоў да Прыроды павінна закладвацца з калыскі і, найперш, у сям'і.

Калі 2009 год абвешчаны Годам роднай зямлі, то гэта значыць і роднай Прыроды, бо гэтыя паняцці цесна звязаныя. Вось і хочацца, каб сёлета для Прыроды было зроблена нешта добрае. Магчыма, нехта не выкіне на абочыну смецце ці не падпаліць вясной сухую траву, а хтосьці не ўскіне стрэльбу...

На апошняе хачу звярнуць асаблівую ўвагу.

І гэтай вясной дазволена адстрэльваць пералётных птушак. А хто з нас не бачыў клін дзікіх гусей у небе. Пачуўшы іх сумныя галасы, людзі пачынаюць шукаць гусей у вышыні.

Некалі існавала павер'е, што калі завязаць вузел і адразу ж развязаць яго, то клін распадзецца. У дзяцінстве даводзілася хуценька вязаць вузлы на папружцы ці вяроўцы, пакуль гусі былі над галавой. Здаралася, што птушкі перастройваліся, выцягваліся ў ланцужок, але яны пастаянна гэта робяць.

Гусі ў небе — гэта эмацыянальнае ўспрыманне Прыроды, магчыма, і не ўсвядомленае.

Крыкі дзікіх гусей трывожаць людзей, вярэдзяць душу, нагадваюць, што мы адно цэлае, толькі вось людзі нешта вельмі важнае забылі...

Але часам птушкам лепш не апускацца на зямлю...

Здаралася, што дзікія гусі гінулі на палях чарадой — паскубуць азімых, якія апрацаваны хімікатамі, і — бывай, неба. Ну, а да паляўнічых не прывыкаць.

— У гусей існуе адзін і той жа маршрут, па якім яны лятаюць ужо не адзін мільён гадоў. Над Баранавіцкім раёнам вясной і восенню дзікія гусі не рэдкасць. Ляцяць праз Палессе на поўдзень. Гэтыя птушкі вельмі асцярожныя, і ўпаляваць іх няпроста. У нас страляць гусей можна, а вось у Польшчы нельга, — сказаў дырэктар Баранавіцкага таварыства паляўнічых і рыбаловаў Алег Гейлаш.

**дырэктар Баранавіцкага таварыства паляўнічых і рыбаловаў Алег Гейлаш.**

А вось што думае Васіль Лісейчыкаў,які доўгі час узначальваў

мясцовы лясгас — чалавек з сям’і патомных лесаводаў:

— Адстрэл пералётнай птушкі — гэта звычайнае варварства. Гусі робяць пералёт у тысячы кіламетраў, каб вывесці дзяцей у тундры, а іх на нашай зямлі забіваюць. Нават у многіх расійскіх губернях дзікіх гусей нельга страляць. Хоць гэтыя птушкі і не падпускаюць блізка чалавека, але пералёт забірае ў іх многа сілы, і гусі апускаюцца на зямлю, каб адпачыць і падкарміцца. А іх тут чакае небяспека.

Ёсць паляўнічыя, якія спецыялізуюцца на дзікіх гусях. Птушкі ляцяць, а яны на аўтамашынах — за імі. Вядуць дзікіх гусей ад Пінска да самага Віцебска — праз усю краіну. І што з таго, што гусі асцярожныя, сёння паляўнічыя маюць наразную зброю з аптычным прыцэлам, так што адлегласць не такая ўжо і праблема. Тут больш азарту, чым прыбытку, бо падчас веснавога пералёту птушкі дужа худыя. У Еўропе паляванне на дзікіх гусей забаронена ўвогуле.

Забітыя паляўнічымі птушкі вясной — адзін бок справы, магчыма, іх не надта шмат — не так проста ўпаляваць тую ж гусь ці качку. Але куды большая шкода — у патрывожанай чарадзе, якая тут жа ўзнімаецца ў неба, калі гучаць стрэлы. Уявіце: аслабленыя даўжэзным пералётам птушкі стомлена апусціліся на зямлю, а іх сустракаюць шротам. Далёка не ўсіх данясуць натруджаныя крылы да месцаў гнездавання. А ўспомнім чапляў, якія ў час міграцыі са Скандынавіі на поўдзень робяць перадышку на вадаёмах нашых рыбгасаў. Толькі на возеры Сялец штогод іх забіваюць па тысячы ці болей. Чаплі быццам бы наносяць цяжкія страты рыбнай гаспадарцы.

"Чаплі кормяцца дробнай рыбай, жабамі, апалонікамі, вадзянымі насякомымі, грызунамі... Падоўгу нерухома стаяць на плыткім месцы, уцягнуўшы галаву...", — напісана ў выданні "Птушкі. Белавежская пушча", выд. "Ураджай", Мінск, 1976 г. Зрабілі з чаплі злоснага браканьера — падлічылі колькі кілаграмаў рыбы яна з’ядае ў дзень. Каб Швецыя ці Нарвегія даведаліся, што з іх чаплямі робяць на в. Сялец, то пайшлі б на нейкі дэмарш. Аднойчы я паспрабаваў пагаварыць з дырэктарам тамашняга рыбгаса, але размовы не атрымалася — розныя погляды на Прыроду. Для мяне яна храм, а для дырэктара — майстэрня.

Пацікавіўся пра дзікіх гусей у інтэрнэце і быў уражаны — працэнтаў семдзесят інфармацыі прысвечана таму, як дзікага гусака засмажыць. Пакаштаваць гусяціны ахвотных многа...

Ад аднаго "прыродазнаўцы" пры пасадзе пачуў, што пара адстрэльваць і лебедзяў, бо ад іх адна зараза.

Не трэба заразу шукаць у Прыродзе. Яна з’яўляецца тады, калі чалавек робіць нейкія непрадуманыя крокі. Адкуль узяўся птушыны грып ці шаленства кароў? Магчыма, гэта адказ Прыроды на нашу дзейнасць?

Перамагчы стэрэатыпнасць мыслення няпроста. Пра адстрэл шэрай чаплі наша газета пісала, уздымалі праблему і іншыя выданні, а што змянілася?

Вось і хочацца, каб у Год роднай зямлі былі зроблены пэўныя захады і не так часта гучалі стрэлы. Хоць бы ў гэты год дзікіх гусей, качак і чапляў не бралі на мушку. А чаму і не?! Заўтра,

як аб’яўлена, у Беларусі пачынаецца веснавое пляванне на птушку. Мяркую, што яшчэ не позна яго адмяніць. Тады нашы ўзнёслыя (і вельмі правільныя!) словы пра сваю зямлю, пра любоў да яе не стануць пустым гукам.

***Сымон Свістуновіч.***

**Источник:** Звязда.-2009.-13 сак.-С. 8.